Адбыўся чаргові пленум камітэта камсамола БДУ, на якім было разгледжана пытанне «Аб выніках трэцяга працоўнага семестра 1978 года і задачах камсамольскай арганізацыі ўніверсітэта па ўдасканаленню працоўнага выхавання ў 1979 годзе».

З дакладам на пленуме выступіў сакратар камітэта камсамола БДУ А. А. Тозік.

На пленуме выступілі В. Міхальчук, камандзір зводнага СБА «Кастрычнік», А. Кавалёва, камісар будатрада «Мара», У. Т. Воднеў, намеснік дэкана ФПМ, А. Рухля, камандзір СБА «Верасы», рэктар універсітэта акадэмік У. А. Белы і іншыя таварышы.

Па разгледжанаму пытанню пленум прыняў пастанову.

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 35 (1222) ● 30 лістапада 1978 г. Цана 2 кап.

Да 60-годдзя БССР і КПБ

## ВЫНІКІ ПРАЦОЎНАГА СЕМЕСТРА



У працоўным семестры 1978 года, года 60-годдзя ВЛКСМ, БССР і Кампартыі Беларусі, на важнейшыя народнагаспадарчыя аб'екты краіны былі накіраваны 69 атрадаў універсітэта агульнай колькасцю 2098 чалавек. Атрады асвоілі 5,6 млн. рублёў капіталаўкладанняў. Імі ўзведзены і здадзены ў эксплуатацыю 2 бальніцы, 23 жылыя дамы, 9 школ, 14 магазінаў, 20 жывёлагадоўчых ферм і шэраг іншых аб'ектаў вытворчага і культурна-бытавога прызначэння.

Байцы студэнцкіх будаўнічых атрадаў па праву ганарацца тым, што партыйныя, савецкія органы бачаць у іх не толькі будаўнікоў, але і актыўных агітатараў і прапагандыстаў, арганізатараў культурна-масавай, шэфскай работы. 1243 лекцыі і гутаркі, 629 канцэртаў мастацкай самадзейнасці для мясцовага насельніцтва, шэфства над сельскімі школамі (адрамантаваны 43 школьныя будынкі, 64 вучэбныя кабінеты, пабудаваны 36 спартыўных пляцовак, перададзена сельскім і школьным бібліятэкам 4397 кніг), работа 52 кансультацыйных пунктаў і 45 піянерскіх лагераў «Спадарожнік» — усё гэта практычнае выкарыстанне ведаў, уменняў, навыкаў, якія студэнты набываюць у сценах нашай ВНУ.

Справай гонару камсамольскай арганізацыі Белдзяржуніверсітэта стала будаўніцтва мемарыяльнага комплексу на месцы бессмяротнага подзвігу А. Матросава ля в. Чарнушкі Пскоўскай вобласці. На ўзвядзенні гэтага аб'екта працаваў камуністычны атрад універсітэта. Мы лічым, што байцы атрада справіліся з адказнай і ганаровай задачай. Мемарыяльны комплекс будзе адкрыт 23 лютага 1979 года.

Нядаўна бюро камітэта камсамола і штаб працоўных спраў падвялі вынікі сацыялістычнага спаборніцтва паміж камсамольскімі арганізацыямі факультэтаў па падрыхтоўцы і правядзенню трэцяга працоўнага семестра. Месцы размеркаваліся наступным чынам: I — гістфак, II — факультэт радыёфізікі і электронікі, III — мехмат, IV — хімфак, V — фізфак, VI — ФПМ, VII і VIII падзялілі юрфак і філфак.

Такім чынам, лідэры ў сацыялістычным спаборніцтве факультэтаў засталіся тыя ж.

Падведзены вынікі сацыялістычнага спаборніцтва і паміж лінейнымі атрадамі. Лепшымі атрадамі універсітэта прызнаны: «Кастрычнік» (зводны, сфарміраваны на базе гістфака, камандзір В. Міхальчук, камісар Г. Храпко), «Верасы» (хімічны факультэт, камандзір А. Рухля, камісар В. Мальцаў), «Сцялуца» (мехмат, камандзір Г. Глобус, камісар В. Мастыка).

Працягам трэцяга працоўнага семестра быў удзел студэнцкай моладзі ва ўборачных сельскагаспадарчых работах. У гэтым годзе ў БДУ імя У. І. Леніна быў сфарміраван зводны сельскагаспадарчы атрад агульнай колькасцю 5488 чалавек.

Зводным ССГА было ўбрана 109386 тон бульбы, 3247 тон гародніны, 597 гектараў ільну. Працэнт выканання нормы выпрацоўкі склаў 115 — 120 працэнтаў. Акрамя таго, студэнты выконвалі будаўнічыя, меліярацыйныя работы, работы на зернетаках і г. д.

Байцамі ССГА праведзена пэўная грамадска-палітычная работа: прачытана 976 лекцый, дано 597 канцэртаў, аформлена 27 клубаў, бібліятэк, аказана дапамога ветэранам вайны і працы, праводзілася работа па збору матэрыялу для напісання летапісу народнай славы.

Сярод зводных факультэцкіх і лінейных сельгасатрадаў было наладжана спаборніцтва. Па яго выніках лепшым сярод факультэтаў стаў філалагічны, другое месца заняў факультэт радыёфізікі і электронікі, III — фізфак, IV — юрфак, V — мехмат, VI — журфак, VII — гістфак, VIII — геафак, IX — хімфак, X — біяфак, XI — ФПМ.

Пераможцам сярод лінейных ССГА выйшаў другі раз атрад «Салярыс», III курс ФПМ (камандзір В. Ланько, камісар Л. Дударчык);

II месца заняў атрад, сфарміраваны на базе 3-й групы I курса мехмата (камандзір А. Халімановіч, камісар А. Бялоцкі);

на трэцім месцы атрад, сфарміраваны на базе 1—2-й груп IV курса гістфака (камандзір А. Зябко, камісар — Н. Дзямідава).

## ПЛАНЕТА ХЛЕБА

**У рэдакцыю нашай газеты паступаюць пісьмы, у якіх выкладчыкі і студэнты дзеляцца тым вялікім уражаннем, якое зрабіла на іх кніга Л. І. Брэжнева «Цаліна». Яна прымусіла многіх успомніць аб тым часе, калі яны ў саставе студэнцкіх будаўнічых атрадаў актыўна ўдзельнічалі ў вялікай бітве за цалінны хлеб, яшчэ раз перажыць шчасце вялікіх здзяйсненняў.**

**«Ёсць хлеб — будзе і песня... Нездарма так гаворыцца. Хлеб заўсёды быў найважнейшым прадуктам, крытэрыем усіх каштоўнасцей. І ў наш век бурных навукова-тэхнічных дасягненняў ён складае першааснову жыцця народаў. Людзі вырваліся ў космас, пакараюць рэкі, моры, акіяны, здабываюць нафту і газ у глыбінях зямлі, авалодалі энергіяй атама, а хлеб застаецца хлебам...»**

**(Л. І. Брэжнеў, «Цаліна»).**

Наша цаліна — гэта сярэдзіна шасцідзесятых гадоў. Тады ўжо на неабсяжных прасторах Казахстана былі апрацаваны і засеяны мільёны гектараў зямлі, якая шчодра плаціла сваім руплівым гаспадарам самым дарагім багаццем — хлебам.

Паўсюдна адчуваліся не толькі моц разгорнутай працы, здзіўляючыя яе здабыткі; яскрава вырысоўваліся велічныя перспектывы асваення цалінных і залежных зямель.

Нас здзіўляў размах працы. Любуючыся бясконцым пшанічным разлівам, неахопным морам залатой збажыны, студэнты разумелі, што кожны з гэтых каласкоў не толькі сагрэты сонцам і напоены рэдкім дажджом. Ён выпеставан чалавечым дыханнем, увабраў у сябе цяпло маладых рук і трапятанне сэрцаў тысяч людзей.

Велічнасць планаў партыі аб'ектыўна злілася з неабсяжнымі прасторамі цаліны і магчымасцямі нашага народа выканаць грандыёзную задачу. Поспех забяспечылі людзі. Згуртаваныя і накіраваныя партыяй, шматнацыянальныя атрады стварылі адзіны цалінны атрад, які ператвараў неабжыты край у хлебны. Аб гэтым піша Л. І. Брэжнеў у кнізе «Цаліна». Яе галоўны герой і той трактарыст, што суткамі не сыходзіў з баразны, і той камсамолец, што загінуў у лютай завеі, і партыйны кіраўнік з райкома на калёсах. Герой кнігі — велічны савецкі чалавек, у якога няма большага шчасця, чым праца на карысць Радзімы.

Мы таксама адчулі асалоду гэтага шчасця. Казахскія стэпы засяляліся і абжываліся. Будаваліся саўгасы, пасёлкі, жывёлагадоўчыя памяшканні. Рукі студэнтаў-будаўнікоў цаніліся нароўні з рукамі, якія сеюць хлеб.

На будоўлях, на касавіцы хлеба — усюды кожны студэнт кіраваўся яснай свядомасцю, неадкладнай неабходнасцю сваёй працы. Жаданні маладога чалавека супадалі з грамадскай неабходнасцю, а сіла моладзі была ідэнтычнай таму вялізнаму размаху будоўлі, які вызначыла партыя.

Я бачу яскрава твары маіх таварышаў, якія працавалі поплеч. Брыгада Леаніда Бохана вярталася са стэпу толькі з песняй — гэта азначала, што дзённы план выканан. Камісар Пабока са сваёй брыгадай збудаваў вялізную майстэрню для рамонту тэхнікі. Майстар Уладзімір Раіцкі ўмеў усё: і дом збудаваць, і рыбы налавіць, і рухавік амаль без бензіну завесці. Анатоль Гарбачоў і Рыгор Кадзет — карэспандэнты студэнцкай газеты — заўсёды паспявалі туды, дзе найбольш ярка раскрывалася героіка студэнцкіх будаўнічых атрадаў.

Цаліна была сапраўднай нашай планетай. Мы самі яе адбудоўвалі. Разам з саманнымі цаглінамі ў сцены дамоў, клубаў і школ мы ўкладвалі часцінку юначых сэрцаў. У вокнах дзіцячых дамоў і яслям мы пакідалі іскрынкі нашых вачэй, а на вуліцах намі ўзведзеных пасёлкаў умацоўвалі таблічкі з назвамі любімых і далёкіх ад Казахстана гарадоў і вёсак. Так мы раднілі Казахстан з Беларуссю.

Я ўдзячны жыццю, якое наканавала мне разам з мільёнамі юнакоў і дзяўчат асвойваць самую прыгожую планету — планету хлеба.

**А. СЛУКА,**
**камандзір СБА «Зубронак» 1966, 1967 гг.**

## ПА БДУ
### ІНФАРМАЦЫЯ

**На біялагічным факультэце пачаліся заняткі народнага універсітэта «Прырода», рэктарам якога выбран Павел Рыгоравіч ПАПОВІЧ.**

Слухачы народнага універсітэта (а іх больш чым 100 чалавек) — студэнты і супрацоўнікі розных факультэтаў БДУ. Вучэбная праграма, на якую адведзена 50 гадзін, разлічана на адзін год. Атрыманыя тэарэтычныя веды пра флору і фауну Зямлі, пра водныя, паветраныя, зямельныя, лясныя рэсурсы і іх ахову і наогул пра ахову навакольнага асяроддзя будуць замацаваны на практычных занятках у Батанічным садзе, у музеях і ў адным з запаведнікаў Беларусі. Для работы ў народным універсітэце «Прырода» запрошаны высокакваліфікаваныя спецыялісты.

**В. ВЯРБІЦКІ,**
**В. САБАЛЕЎСКІ,**
**студэнты журфака.**

* *

**У аудыторыі гучалі песні Дзіна Рыда. Яны палымяна заклікалі да барацьбы, расказвалі аб цяжкім жыцці чалавека ў капіталістычным свеце.**

Так не зусім звычайна пачалася палітінфармацыя ў нашай групе.

«Дзін Рыд — на волі!» — гэту вестку ўсе мы сустрэлі з вялікай радасцю. З трэскам правалілася спроба судовых улад ЗША расправіцца з Дзінам і яго сябрамі, якія былі арыштаваны на мітынгу сельскагаспадарчых працоўных у горадзе Дэлана ў штаце Мінесота. Шырокая міжнародная салідарнасць, сусветная кампанія пратэсту супраць расправы, якая рыхтавалася, вярнулі волю Дзіну Рыду і яго сябрам.

Уважліва слухалі студэнты ўсхваляваны расказ аднакурсніцы Марыі Мітраховіч аб жыцці і барацьбе прагрэсіўнага амерыканскага спевака.

**Т. ПАРАХНЕВІЧ,**
**студэнтка журфака.**

* *

27 лістапада адбылося чарговае пасяджэнне савета універсітэта. Былі заслуханы пытанні: «Аб выніках набору студэнтаў на першыя курсы ў 1978 годзе і задачах па падрыхтоўцы набору ў 1979 годзе», «Аб выкананні плана набору аспірантаў у 1978 годзе» і іншыя. З дакладам аб выніках набору студэнтаў выступіў адказны сакратар прыёмнай камісіі дацэнт А. А. Лабуда. Па другому пытанню выступіў выконваючы абавязкі прарэктара па навуковай рабоце дацэнт А. В. Чалей.

У абмеркаванні даклада прынялі ўдзел дэканы факультэтаў, загадчыкі кафедр і іншыя таварышы.

**Л. АНДРЭЕВА.**

# ЧЫРВАНАСЦЯЖНАЙ БЕЛАРУСКАЙ

## ГАНАРЫМСЯ ПА ПРАВУ

Гарыць медзь аркестра. Гучаць хвалюючыя ваенныя маршы як адлюстраванне баявой гісторыі нашай арміі, а з ёй і гісторыі Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі. У зале акруговага Дома афіцэраў ветэраны, якія стваралі гэту слаўную гісторыю пад грукат грамадзянскай і Вялікай Айчыннай, а з імі побач — тыя, хто ўносіць свой ратны ўклад у летапіс акругі сёння. У зале — выкладчыкі і студэнты Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна.

Дакладам «60 год на варце заходніх рубяжоў Радзімы» навуковую канферэнцыю, прысвечаную юбілею ЧБВА, адкрывае камандуючы войскамі акругі генерал - палкоўнік танкавых войск М. М. Зайцаў.

Я гляджу ў залу, на ветэранаў, якія назаўсёды захавалі водбліскі пераможных атак і памяць аб выпрабаваннях Радзімы. Датыкненне да памяці заўсёды хвалюе кожнага з тых, за чыімі плячыма нялёгкія кіламетры пыльных, у выбоінах, франтавых дарог, хто быў на ты са смерцю. І тых з прысутных, хто не бачыў вайны, хто ведае яе па фільмах і кнігах, па расказах бацькоў. Таму што ўсе, каму дарагі мір, не павінны, не маюць права забываць аб вайне.

Радуе поспех воінаў ЧБВА. На тварах тых, хто сядзіць у зале, — упэўненасць, што наша армія ў любую мінуту гатова выступіць на ахову заваёў Кастрычніка.

Аб моцнай дружбе і цесных шэфскіх сувязях калектыву Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна і воінаў ЧБВА, аб гераізме студэнтаў і выкладчыкаў у гады Вялікай Айчыннай вайны, аб вялікай рабоце па ваенна-патрыятычнаму выхаванню моладзі расказваюць прарэктары універсітэта А. Я. Малышаў і У. Р. Івашын, дэкан гістфака І. В. Царук, студэнт гістфака І. Велічанскі.

Цёплыя словы ўдзячнасці ў адрас прафесарска - выкладчыцкага саставу універсітэта выказалі падпалкоўнік Л. І. Кавалёў і выпускнік БДУ падпалкоўнік В. П. Фалецкі.

Наша сённяшняя сустрэча паслужыць умацаванню ваенна - патрыятычнага выхавання студэнтаў універсітэта і воінаў акругі. Няхай і надалей расце і мацнее дружба паміж намі, падводзячы вынікі канферэнцыі, сказаў член Ваеннага савета, начальнік Палітычнага ўпраўлення ЧБВА генерал-палкоўнік А. В. Дзебалюк.

**В. ДУДКО,**
**студэнт журфака.**



**На здымку: у прэзідыуме канферэнцыі.**

**Фота А. Шарава.**

## НА ВАРЦЕ ЗАХОДНІХ

НАША канферэнцыя праводзіцца ў знамянальныя дні. Усё сённяшняе жыццё азорана святлом нядаўніх урачыстасцей, прысвечаных 61-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі і першай гадавіне новай Канстытуцыі СССР. Яны выліліся ў яркую дэманстрацыю выдатных дасягненняў савецкага народа і выклікалі новы магутны ўздым яго палітычнай і працоўнай актыўнасці.

Знамянальным быў для нас мінулы год. Гэта год вялікіх поспехаў працаўнікоў індустрыі і сельскай гаспадаркі, выдатных дасягненняў у даследаванні і асваенні космасу.

У адзіным страі з усім савецкім народам важкі ўклад у будаўніцтва камунізму ўносяць працоўныя Савецкай Беларусі.

У летапіс гісторыі Савецкай дзяржавы і яе Узброеных Сіл нямала слаўных старонак упісалі воіны нашай Беларускай ваеннай акругі. Яна была створана загадам Рэвалюцыйнага Ваеннага Савета рэспублікі № 297 ад 28 лістапада 1918 года. У пачатку яна называлася Мінскай, а з 14 снежня — Заходняй ваеннай акругай.

З таго часу пад рознымі назвамі, але нязменна ў адзіным баявым страі з усёй Чырвонай Арміяй беззапаветна змагаліся яе воіны за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы.

Воіны Заходняга фронту самаадданa абаранялі рубяжы маладой Рэспублікі Саветаў на розных франтах. Злучэнні і часці, сфарміраваныя і абучаныя на тэрыторыі Беларусі, адпраўляліся на бой з Калчаком, Дзенікіным і іншымі ворагамі маладой рэспублікі.

Асаблівую ролю адыгралі воіны Заходняга фронту вясной і летам 1920 года, калі буржуазная Польшча, якую падтрымлівалі імперыялісты Англіі, Францыі і ЗША, развязала інтэрвенцыю супраць нашай краіны. Камандзіры і байцы фронту праявілі выключную мужнасць і волю да перамогі.

**Рэўваенсавет рэспублікі па заслугах ацаніў гераізм асабовага саставу часцей і злучэнняў фронту. За баявыя заслугі многія часці, у тым ліку ўсе палкі 16-й стралковай дывізіі імя Кінвідзе, 241-ы Сялянскі, 242-гі Волжскі, 27-ы кавалерыйскі палкі 27-й Омскай дывізіі былі ўзнагароджаны ганаровымі Чырвонымі сцягамі. Большасць з іх і сёння ў баявым страі Савецкіх Узброеных Сіл. Звыш тысячы чырвонаармейцаў, камандзіраў і палітработнікаў былі ўдастоены ордэна Чырвонага Сцяга.**

**Воіны акругі ганарацца тым, што ў тыя гады ў справу яе ўмацавання ўнеслі вялізны ўклад У. І. Ленін, а таксама вядомыя дзеячы партыі і Савецкай дзяржавы М. В. Фрунзе, Г. К. Арджанікідзе, Ф. Э. Дзяржынскі, І. В. Сталін, В. А. Антонаў-Аўсеенка, А. В. Крыленка, Я. Б. Гамарнік, А. Ф. Мяснікоў, М. Н. Тухачэўскі і многія іншыя.**

Грамадзянская вайна на тэрыторыі Беларусі скончылася, але воінам Заходняга фронту давялося весці барацьбу з бандамі Булак-Булаховіча, Савінкава і іншымі, падрыхтаванымі ў Польшчы і перакінутымі ў Палессе. Да пачатку 1922 года і гэта задача была паспяхова вырашана.

Перыяд грамадзянскай вайны, такім чынам, займае асобае месца ў гісторыі акругі. Дзякуючы мудраму кіраўніцтву і вялікім намаганням Камуністычнай партыі недастаткова арганізаваныя і слаба абучаныя добраахвотныя фарміраванні ператварыліся ў баявыя кадравыя часці Чырвонай Арміі. Яны разграмілі аб'яднаныя сілы інтэрвентаў і белагвардзейцаў на заходніх рубяжах краіны.

Пасля заканчэння грамадзянскай вайны пачаліся мірныя будні ратнай вучобы асабовага саставу акругі. Але не толькі гэтым займаліся воіны. Яны актыўна ўдзельнічалі ў работах па аднаўленню народнай гаспадаркі Беларусі, дапамагалі ва ўборцы ўраджаю, у культурным развіцці вёскі, у ліквідацыі непісьменнасці, у нарыхтоўцы паліва.

Шырокае распаўсюджанне ў тыя гады ў войсках атрымалі суботнікі і нядзельнікі. Толькі часці 16-й арміі, напрыклад, з 1 студзеня па 7 сакавіка 1921 года правялі каля трох тысяч суботнікаў з мэтай уздыму народнай гаспадаркі Беларусі.

Разам з тым воіны свята выконвалі запавет У. І. Леніна аб тым, што трэба быць пастаянна напагатове, памятаць, што «ад усякага нашэсця мы заўсёды на валаску», што трэба, як зрэнку вока, берагчы баяздольнасць і баявую гатоўнасць арміі.

З 1938 года акруга перайменавана ў Беларускую Асобую, а ў 1940 годзе ў сувязі з абвастрэннем міжнародных абставін і пагрозай фашысцкай агрэсіі атрымала найменаванне Заходняя Асобая ваенная акруга.

Важнай падзеяй у жыцці войск акругі ў перадваенныя гады, праверкай іх баявой гатоўнасці быў вызваленчы паход у Заходнюю Беларусь і вызваленне яе народа ад буржуазна-панскага прыгнёту. Войскі акругі, перайшоўшы мяжу на шырокім фронце, за 12 дзён прайшлі 240—300 кіламетраў на Захад. Увесь беларускі народ быў аб'яднаны ў адзіную сям'ю.

Пачатак другой сусветнай вайны і ўзмацненне ваеннай небяспекі, агрэсіўныя імкненні фашысцкай Германіі настойліва дыктавалі правядзенне неадкладных мер па ўмацаванню Чырвонай Арміі і Флоту. Усебакова гэта праблема была абмеркавана на пленуме ЦК ВКП(б) у сакавіку 1940 года. Камуністычная партыя распрацавала вялікую праграму пераўзбраення Узброеных Сіл. У першую чаргу яна датычала прыгранічных акруг, у тым ліку і Заходняй Асобай ваеннай акругі.

**На жаль, гісторыя адвяла нам вельмі мала часу. Удалося зрабіць не ўсё, што намячалася. Але ў тыя перадваенныя гады быў закладзен фундамент нашых будучых перамог. І калі грымнула вайна, увесь свет пераканаўся ў трываласці гэтага фундамента.**

**22 чэрвеня 1941 года ўзброеная да зубоў гітлераўская Германія вераломна напала на нашу Радзіму. Пачалася Вялікая Айчынная вайна савецкага народа супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Акруга перайменоўваецца ў Заходні фронт.**

**Сярод тых, хто на світанку гэтага дня ўступіў у барацьбу са смяротным ворагам, былі воіны нашай акругі. Адным з першых ва ўвесь голас абвясціў аб неперможнасці нашай арміі гарнізон Брэсцкай крэпасці. Гітлераўскае камандаванне кінула для авалодання крэпасцю 45-ю пяхотную дывізію, якая годам раней урачыстым маршам уступіла ў сталіцу Францыі, павергнутай за 40 дзён. Цяпер амаль столькі ж часу фашысты затрацілі для таго, каб авалодаць цытадэллю над Бугам.**

Па-геройску змагаліся на подступах да Кобрына рэшткі 22-й танкавай дывізіі на чале з генерал-маёрам В. П. Пуганавым.

Храбра змагаліся ўсе воіны

## ВЫХОЎВАЕМ ПАТРЫЁТАЎ

**Ад імя ваеннаслужачых — выпускнікоў Беларускага дзяржаўнага універсітэта выступіў падпалкоўнік В. ФАЛЕЦКІ.**

Вельмі знамянальна, што разам з намі, тымі, хто служыць у войсках ЧБВА, адзначаюць сёння слаўны юбілей Беларускай ваеннай акругі выкладчыкі, студэнты, партыйная і камсамольская арганізацыі старэйшай ВНУ рэспублікі, якая ў значнай ступені акумулюе яе грамадскае жыццё, важнае месца ў рабоце якой займаюць пытанні ваенна-патрыятычнага выхавання, падрыхтоўкі падрастаючага пакалення да абароны Радзімы.

Характар гэтай сувязі не толькі ў тым, што мы сумесна праводзім канферэнцыю, прысвечаную юбілею акругі, але перш за ўсё ў тым, што на працягу ўсёй гісторыі адной з найбольш заслужаных акруг Савецкіх Узброеных Сіл у яе войсках служылі і служаць многія выпускнікі універсітэта.

Атрыманыя ў аудыторыях універсітэта веды яны ўмела выкарыстоўваюць у сваёй практычнай рабоце па навучанню і выхаванню маладых абаронцаў Радзімы.

Многа выпускнікоў Беларускага дзяржаўнага універсітэта сярод афіцэраў запасу, якія сёння ў розных галінах народнай гаспадаркі ўдзельнічаюць у будаўніцтве камуністычнага грамадства. Але, атрымаўшы разам з падрыхтоўкай па спецыяльнасці адпаведныя ваенныя веды, яны заўсёды гатовы заняць сваё месца ў страі камандзіраў, палітработнікаў, інжынерна-тэхнічнага саставу войск акругі. Знаходзячыся на зборах, вучэннях, яны заўсёды паказваюць высокую ваенную падрыхтоўку, імкненне да больш глыбокага вывучэння асноў сучаснага бою. Іх вызначае асаблівы, універсітэцкі почырк мыслення, дзеянняў, ініцыятыва.

Успамінаючы сёння гады вучобы, я з вялікай удзячнасцю ўспамінаю прафесарска-выкладчыцкі састаў універсітэта, нашых настаўнікаў, якія, не лічачыся з часам, не шкадуючы сваіх сіл і здароўя, штодзённа і цярпліва перадавалі нам такія неабходныя веды.

Нярэдка студэнтам-ваеннаслужачым даводзіцца садзіцца за студэнцкую лаўку непасрэдна пасля бяссонных начэй тактычных вучэнняў або выканання складаных задач баявой і палітычнай падрыхтоўкі. Але кожны раз мы сустракалі гатоўнасць выкладчыкаў даць дадатковую кансультацыю, растлумачыць найбольш складаныя тэмы вывучаемага матэрыялу. Студэнты-ваеннаслужачыя ніколі не адчуваюць, што яны знаходзяцца на нейкім асобым становішчы, але яны не могуць не заўважыць, што пастаўленая да іх высокая патрабавальнасць пастаянна спалучаецца з клопатам і ўвагай.

Уклад калектыву Беларускага дзяржаўнага універсітэта ў павышэнне баявой гатоўнасці войск акругі, умацаванне абараназдольнасці краіны — асаблівы. Не з'яўляючыся спецыфічна ваенным, ён нясе ў сабе магутны зарад ідэйнага і практычнага вопыту ў рашэнні складаных задач баявой і палітычнай падрыхтоўкі.

Вучоба ва універсітэце ўзбагаціла нас палітычнымі і спецыяльнымі ведамі, узброіла марксісцка-ленінскай тэорыяй і метадалогіяй, дала нам моцную ідэйную загартоўку.

Аднак, як падкрэслівае член Палітбюро ЦК КПСС, міністр абароны СССР Маршал Савецкага Саюза Дзмітрый Фёдаравіч Усцінаў, ваенная справа не стаіць на месцы. І каб заўсёды быць на ўзроўні патрабаванняў часу, неабходна пастаянна і мэтанакіравана папаўняць і паглыбляць раней атрыманыя веды, расшыраць свой кругагляд, павышаць палітычны і культурны ўзровень.

Зыходзячы з гэтага патрабавання, мы — выпускнікі універсітэта імкнёмся штодзённа на вучэбных занятках, у ходзе ўсяго свайго жыцця і дзейнасці не толькі вучыць сваіх падначаленых, але і вучыцца самім, удумліва вывучаць і браць на ўзбраенне перадавы вопыт навучання і выхавання асабовага саставу, умела выкарыстоўваць яго ў сваёй практычнай рабоце.

# ВАЕННАЙ АКРУЗЕ — 60 ГОД!

## РУБЯЖОЎ РАДЗІМЫ

Заходняга фронту. Ужо ў першыя гадзіны вайны камандзір знішчальнага звяна старшы лейтэнант Д. В. Кокараў, зрасходаваўшы ўсе боепрыпасы, тараніў фашысцкі самалёт. У той жа дзень тараны здзейснілі лейтэнант П. С. Рабцаў над Брэстам і лейтэнант М. С. Гудзімаў над Пружанамі. Пазней такі ж подзвіг здзейснілі лётчыкі І. Іваноў, Л. Буцерлін, П. Харытонаў, С. Здораўцаў, М. Жукаў.

Сімвалам мужнасці і самаахвяравання ў імя Радзімы стаў подзвіг экіпажа самалёта ў саставе М. Ф. Гастэлы, А. А. Бурдзенюка, Г. М. Скарабагатага і А. А. Калініна. Яны накіравалі бамбардзіроўшчык, які гарэў, на калону варожых танкаў. На розных франтах гэты подзвіг паўтарылі за гады вайны звыш трохсот экіпажаў і лётчыкаў.

Масавы гераізм праявілі ў кровапралітных баях пры абароне Мінска воіны 100-й, 64-й, 161-й і 108-й стралковых дывізій. Насмерць змагаліся пад Магілёвам воіны 172-й стралковай дывізіі. Яны амаль на месяц затрымалі фашысцкія полчышчы, якія рваліся да Масквы. Жорсткія баі вялі войскі Заходняга фронту пад Барысавам, Гомелем, Віцебскам, Оршай, Смаленскам, Вязьмай, Ельняй і ў іншых месцах. Яны наносілі па ворагу магутныя контрудары, знішчаючы адборныя войскі гітлераўцаў.

Залатой старонкай у гісторыю Вялікай Айчыннай вайны ўвайшлі баявыя справы воінаў 316-й стралковай дывізіі пад камандаваннем генерала І. В. Панфілава. 28 герояў гэтай дывізіі 16 лістапада 1941 года ля раз'езда Дубасекава знішчылі 32 варожыя танкі. У крытычныя мінуты яны са звязкамі гранат кідаліся пад танкі і, ахвяруючы жыццём, выконвалі свой доўг перад Бацькаўшчынай.

У баях пад Масквой ля вёскі Рабінкі сержант 1319-га стралковага палка В. Васількоўскі грудзьмі закрыў амбразуру варожага дзота. Што можа параўнацца па сіле духу з гэтым бязмежным па адвазе подзвігам, які ў гады вайны быў здзейснен больш чым 200 разоў?!

Выматаўшы праціўніка ў цяжкіх абарончых баях, войскі фронту ў пачатку снежня 1941 года перайшлі ў рашучае контрнаступленне, якое перарасло ў агульнае наступленне Чырвонай Арміі. Вораг пад Масквой быў разбіт. Разлікі Гітлера захапіць Маскву праваліліся разам з яго планам «маланкавай вайны». Перамога Чырвонай Арміі з'явілася рашучым паваротам ваенных падзей у карысць СССР. Яна аказала вялікі ўплыў на ўвесь далейшы ход Вялікай Айчыннай і ўсёй другой сусветнай вайны.

**У грандыёзнай бітве Савецкіх Узброеных Сіл з гітлераўскімі ордамі з першага і да апошняга дня вайны змагаліся войскі Заходняга — 3-га Беларускага фронту. 1418 дзён і начэй ішлі яны суровымі дарогамі вайны. Нялёгкі, але зайздросны лёс выпаў на іх долю.**

**Залатымі літарамі ў гераічны летапіс фронту ўпісаны дзесяткі выйграных бітваў з фашызмам. Звыш ста дваццаці адборных гітлераўскіх дывізій з груп армій «Цэнтр» і «Поўнач» разбіты войскамі фронту.**

**Яны вызвалілі сотні гарадоў і тысячы вёсак. Слава вызваліцеляў рускіх, беларускіх і літоўскіх гарадоў, слава герояў баёў ва Усходняй Прусіі адлюстравана ў ганаровых найменаваннях, якія былі прысвоены злучэнням і часцям фронту.**

**Тысячы салдат Заходняга — 3-га Беларускага фронту, сыны ўсіх народаў, якія насяляюць нашу Радзіму, праславілі сябе ў баях за гонар, свабоду і незалежнасць.**



Камуністычная партыя і Савецкі ўрад адзначылі іх воінскую доблесць высокімі ўрадавымі ўзнагародамі. Больш чым 700 воінаў сталі Героямі Савецкага Саюза, дзевятнаццаць з іх удастоены гэтага звання двойчы. Баявыя ордэны ўпрыгожылі сцягі многіх злучэнняў і часцей фронту. Тысячы і тысячы воінаў узнагароджаны ордэнамі і медалямі.

Сёння з вялікім гонарам можна гаварыць аб тым, што наша акруга па праву называецца кузняй ваенных кадраў. Тут у розныя гады служылі і праходзілі школу баявога майстэрства маршалы Савецкага Саюза, якія потым сталі выдатнымі палкаводцамі — М. Н. Тухачэўскі, Г. К. Жукаў, А. А. Грэчка, А. М. Васілеўскі, А. І. Ягораў, Р. Я. Маліноўскі, І. І. Якубоўскі, І. С. Конеў, К. І. Ракасоўскі, В. Д. Сакалоўскі, С. К. Цімашэнка, М. В. Захараў, В. І. Чуйкоў, К. А. Мерацкоў, А. І. Яроменка, І. Х. Баграмян, галоўны маршал артылерыі Н. Н. Воранаў, галоўны маршал бранятанкавых войск П. І. Ротмістраў, генералы арміі І. Д. Чарняхоўскі, В. А. Пянькоўскі і многія іншыя заслужаныя генералы.

З заканчэннем Вялікай Айчыннай вайны перастаў існаваць 3-ці Беларускі фронт. Яго пераемнікам стала ўноў створаная Беларуская ваенная акруга.

**Арганізуючы аднаўленне разбуранай народнай гаспадаркі, загойваючы страшныя раны, якія нанесла вайна, Камуністычная партыя і Савецкі ўрад разумелі, што імперыялізм захаваўся, што неабходна ўсямерна ўмацоўваць абарону краіны, што заходнія рубяжы павінны быць пад надзейнай аховай. Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі патрабаваў глыбока вывучыць вопыт Вялікай Айчыннай вайны і ўкараняць яго ў баявой і палітычнай падрыхтоўцы.**

**Улічваючы, што Заходні напрамак захоўвае сваё першаступеннае значэнне і ў нашы дні ў справе абараназдольнасці нашай Радзімы і краін сацыялістычнай садружнасці, воіны Беларускай ваеннай акругі і ў пасляваенны перыяд працягваюць удасканальваць сваё баявое майстэрства з улікам магчымасці вядзення баявых дзеянняў як з прымяненнем ядзернай зброі, так і з выкарыстаннем звычайных сродкаў вайны.**

Авалодваючы навейшай зброяй і баявой тэхнікай, воіны ЧБВА настойліва ажыццяўляюць ленінскі запавет «Вучыцца ваеннай справе належным чынам».

За вялікі ўклад у справу ўмацавання абароннай магутнасці Савецкай дзяржавы і яе ўзброенай аховы, поспехі ў баявой і палітычнай падрыхтоўцы, падтрыманне высокай баявой гатоўнасці войск і ў сувязі з 50-годдзем Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту Беларуская ваенная акруга была ўзнагароджана ордэнам Чырвонага Сцяга.

Чырванасцяжная Беларуская ваенная акруга мае сучасную баявую тэхніку і зброю, якой нас шчодра забяспечвае савецкі народ. Асабовы састаў прыкладае шмат намаганняў, каб у дасканаласці валодаць гэтай тэхнікай, яшчэ вышэй узняць воінскае майстэрства і баявую гатоўнасць.

**М. М. ЗАЙЦАЎ,**
**камандуючы войскамі ЧБВА,**
**генерал-палкоўнік танкавых войск.**

## *Баявыя традыцыі захоўваем*

У БАЯХ са шматлікімі ворагамі сацыялістычнай Бацькаўшчыны, у штодзённай ратнай працы ўзброеныя абаронцы Краіны Саветаў набылі багаты вопыт, выпрацавалі пэўныя маральныя нормы, правілы і звычаі, якія, перадаючыся ад аднаго пакалення да другога, сталі непарушнымі традыцыямі. У гэтых цудоўных традыцыях заключана вялікая сіла прыкладу, натхняючая нашых воінаў узорна і з гонарам выконваць свой свяшчэнны абавязак перад Радзімай, ісці па слядах старэйшых, раўняцца на герояў мінулага, заўсёды і ва ўсім быць падобнымі да іх, памнажаць слаўныя іх справы.

Нашы камандзіры, палітработнікі, партыйныя і камсамольскія арганізацыі праводзяць вялікую работу па выхаванню асабовага саставу на баявых традыцыях акругі. Прапаганда прыкладаў вернасці воінскаму доўгу, ваеннай прысязе, узораў гераізму, мужнасці і адвагі, праяўленых воінамі злучэння і часці у баях з ворагамі сацыялістычнай Бацькаўшчыны, маюць выключнае значэнне для фарміравання ў ваеннаслужачых палка неабходных маральна-баявых якасцей.

Баявыя традыцыі Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі служаць для нас крыніцай сілы, якая з'яўляецца мабілізуючым фактарам у рашэнні задач баявой вучобы. Мы ганарымся сваёй роднай дывізіяй і яе ўдзелам у стварэнні гісторыі Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі. Наша дывізія з'яўляецца ўдзельніцай вызвалення Савецкай Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Гвардзейцы палка пастаянна ўдасканальваюць сваё баявое майстэрства. Аб гэтым наглядна сведчаць прыклады ратнай баявой вучобы. Высокую палявую вывучку, самаадданасць, мужнасць, самавалоданне праявілі воіны палка на вучэннях «Беразіна». На заснежаных палях Беларусі асабовы састаў на гэтых вучэннях паказаў выдатную вывучку, майстэрскае валоданне зброяй і баявой тэхнікай.

У 1978, юбілейным годзе, полк дабіўся выдатных вынікаў. Кожны другі воін стаў выдатнікам баявой і палітычнай падрыхтоўкі. Заўсёды і ва ўсім наперадзе ідуць камуністы і камсамольцы. Мы разумеем, што дасягнутае не мяжа, а толькі трамплін для ўзяцця новых вышынь у баявым удасканаленні.

Наш полк у 1979 навучальным годзе выступае ініцыятарам сацыялістычнага спаборніцтва ў сухапутных войсках. Узважыўшы свае магчымасці, мы ўзялі высокія сацыялістычныя абавязацельствы. Мы абавязваемся выхаваць 50 працэнтаў выдатнікаў баявой і палітычнай падрыхтоўкі, 70% класных спецыялістаў, 90% значкістаў ВСК, 95% спартсменаў - разраднікаў. Кожны з воінаў палка разумее, што абавязацельствы высокія, і іх выкананне будзе залежаць ад высокай якасці і эфектыўнасці навучальнага працэсу, рацыянальнага выкарыстання вучэбнага часу, умелага выкарыстання мабілізуючай сілы сацыялістычнага спаборніцтва для далейшага павышэння пільнасці і баявой гатоўнасці. У асабовага саставу ёсць патрыятычнае імкненне, веды і ўменне для поўнага выканання ўзятых абавязацельстваў.

У палку праводзіцца вялікая работа па выхаванню воінаў на слаўных баявых традыцыях акругі, злучэння і часці. Перад асабовым саставам палка часта выступаюць ветэраны Вялікай Айчыннай вайны. З мэтай выхавання гвардзейцаў на баявых традыцыях у часці праводзіцца шмат разнастайных масава-палітычных мерапрыемстваў. Усе яны цесна ўвязваюцца з задачамі, якія выконваюцца асабовым саставам. Надоўга запомніцца асабоваму саставу тэматычны вечар «Нам дарогі гэтыя забыць немагчыма». Вечар пачаўся з пастраення на плацы. Пасля ўрачыстага вынасу баявога сцяга ўсе накіраваліся ў клуб. Афіцэры і прапаршчыкі былі пры ордэнах і медалях, выдатнікаў баявой і палітычнай падрыхтоўкі віталі ветэраны вайны. Памяшканне клуба ў святочным убранні. Гучалі песні Вялікай Айчыннай вайны, песні аб партыі і арміі.

З мэтай выхавання асабовага саставу на баявых традыцыях у палку шырока выкарыстоўваецца дэманстрацыя кінафільмаў і абмеркаванне кніг на гісторыка-патрыятычную тэму. З вялікай цікавасцю воіны сустрэлі ўспаміны Л. І. Брэжнева «Малая зямля», «Адраджэнне» і «Цаліна». Прасякнутыя любоўю да Радзімы, адданасцю справе камунізму, старонкі ўспамінаў нясуць магутны зарад энергіі, патрыятычных імкненняў, якія мабілізуюць воінаў палка на ўзорнае выкананне свайго доўгу перад Радзімай. Вялікай папулярнасцю ў асабовага саставу карыстаюцца мемуары военачальнікаў. Жывую цікавасць выклікала, напрыклад, абмеркаванне кнігі К. Ракасоўскага «Салдацкі доўг». Рыхтуецца таксама канферэнцыя чытачоў па раману Ю. Бондарава «Гарачы снег». З вялікай цікавасцю воіны палка прачыталі кнігу камандуючага войскамі нашай акругі генерал-палкоўніка танкавых войск М. М. Зайцава «На варце Айчыны».

Баявая гісторыя нашага палка адлюстравана ў афармленні пакоя баявой славы. Выбран яе савет, якім кіруе ўдзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ветэран часці прапаршчык В. Я. Пузырэўскі. У палку арганізуюцца сустрэчы з ветэранамі, чытаюцца лекцыі, праводзяцца гутаркі аб баявых традыцыях Савецкіх Узброеных Сіл, аб баявым шляху ЧБВА, злучэнні і часці.

Знаёмства з канкрэтнымі прыкладамі гераізму нараджае ў маладых воінаў пачуццё гонару за слаўныя справы старэйшага пакалення, выклікае ў іх імкненне трымаць раўненне на подзвігі дзядоў і бацькоў, прыводзіць да разумення неабходнасці барацьбы за новыя поспехі ў дасягненні баявога майстэрства.

Памнажаючы дасягнутыя поспехі, асабовы састаў падраздзяленняў палка нясе службу, вучыцца, жыве пад дэвізам разгарнуўшагася ў новым навучальным годзе спаборніцтва: «Пільна стаяць на варце заваёў сацыялізму, усямерна павышаць баявую гатоўнасць і ўзровень воінскага майстэрства».

Бессмяротныя подзвігі старэйшых пакаленняў клічуць і натхняюць гвардзейцаў палка на самаадданае служэнне Радзіме.

**Л. І. КАВАЛЁЎ,**
**камандзір чатырыжды ардэнаноснага палка Чырванасцяжнай Рагачоўскай ордэнаў Суворава і Кутузава мотастралковай дывізіі імя Вярхоўнага Савета БССР, падпалкоўнік.**

# Подзвігі іх не забудзем



**У. Р. ІВАШЫН,**
**прарэктар БДУ па вучэбнай рабоце гуманітарных факультэтаў**

У разгром нямецка-фашысцкіх захопнікаў вялікі ўклад унеслі ўсе працоўныя СССР, у тым ліку і Беларусі, на долю якой у гады вайны выпалі асабліва цяжкія выпрабаванні. Актыўны ўдзел у гэтым бяспрыкладным подзвігу прымалі выкладчыкі і студэнты нашага універсітэта. Ужо ў першыя дні вайны 450 выкладчыкаў і студэнтаў пайшлі ў дзеючую армію. Многія з іх аддалі жыццё за перамогу над ворагам.

Сярод іх — студэнт-камуніст Іван Рыбакоў, які гераічна загінуў у верасні 1943 года. Слаўны баявы шлях прайшоў камсамолец Леанід Сокал. Ён загінуў пад Мажайскам. Героямі загінулі на фронце добраахвотнікі-дэсантнікі камсамольцы гістфака Мікалай Бабчынскі і Афанасій Налівайка. Пад Ленінградам загінуў студэнт геафака Мікалай Кукарэка.

Удзельнічаў у баях пад Масквой, на Курскай дузе, пры фарсіраванні Дняпра выпускнік гістфака К. К. Герман, цяпер прафесар, доктар гістарычных навук.

Аспірантам пайшоў на фронт Р. М. Трухноў, цяпер доктар гістарычных навук, прафесар.

Слаўны баявы шлях ад Волгі да Берліна прайшоў выпускнік гістфака П. З. Савачкін. Мужна змагаліся з ворагам і многія іншыя студэнты і выкладчыкі нашага універсітэта.

Слаўнай старонкай у гісторыі універсітэта з'яўляюцца гераічныя подзвігі яго пітомцаў, якія ўдзельнічалі ў партызанскім руху і падпольнай барацьбе.

Ва універсітэце цяпер працуюць 350 ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны. Усе яны з'яўляюцца актыўнымі ўдзельнікамі грамадска-палітычнай работы, карыстаюцца вялікім аўтарытэтам сярод супрацоўнікаў і студэнтаў. Яны — выдатныя прапагандысты гераічных рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцый Камуністычнай партыі і савецкага народа.

**А. Я. МАЛЫШАЎ,**
**прарэктар БДУ па вучэбнай рабоце прыродазнаўчых факультэтаў**

У ліку першых, хто ўзяў шэфства над часцямі Беларускай ваеннай акругі, слаўнае 60-годдзе якой мы адзначаем, быў Беларускі дзяржаўны універсітэт.

З 1925 года ва універсітэце пачала сваю работу ваенная кафедра, у 1926 годзе быў адкрыт ваенны кабінет. Праводзілася вышэйшая дапрызыўная падрыхтоўка, якая дазваляла рыхтаваць са студэнтаў каманды састаў запасу.

Належыць адзначыць, што да правядзення ваенных заняткаў прыцягваліся вопытныя камандзіры. Некалі ва універсітэце выкладаў камандзір палка Г. К. Жукаў.

Калі пачала ліквідавацца сістэма ўсевобуча, ва універсітэце разгарнулі рознабаковую абаронна - масавую работу сярод студэнтаў ячэйкі «Саюз таварыстваў сяброў абароны і авіяцыйна-хімічнага будаўніцтва ў СССР» (Асаавіяхім). Была створана сетка ваенна-тэхнічных гурткоў, асаавіяхімаўскіх куткоў. Паводзіліся «тыдні» і «дэкады» абароны, замацоўваліся сувязі членаў Асаавіяхіма з чырвонаармейцамі часцей Беларускай ваеннай акругі.

Ваенна - навучальная і спартыўная работа Асаавіяхіма арганічна спалучалася з выхаваннем студэнцтва ў духу патрыятызму, высокай рэвалюцыйнай пільнасці, асабістай адказнасці за абарону сацыялістычнай Бацькаўшчыны.

Вялікая рознабаковая абаронна - масавая работа, якая праводзілася ва універсітэце, адыграла важную ролю ў падрыхтоўцы студэнцкай моладзі да суровых выпрабаванняў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

У суровым 1943 годзе, калі наш універсітэт пачаў работу на станцыі Сходня пад Масквой, студэнты аказвалі дапамогу раненым байцам у падшэфным шпіталі, добраахвотна станавіліся донарамі.

Цяпер Беларускі універсітэт разам з падрыхтоўкай студэнцкай моладзі па выбранай спецыяльнасці рыхтуе і кадры афіцэраў запасу. Падрыхтоўка афіцэраў запасу вялася і вядзецца пад самай пільнай і неаслабнай увагай кіраўніцтва Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі.

* * *

**І. В. ЦАРУК,**
**дэкан гістарычнага факультэта БДУ**

Ва універсітэце склалася пэўная сістэма ваенна-патрыятычнага выхавання. Яна вядзецца па наступных напрамках: прапаганда ленінскіх ідэй, палажэнняў Праграмы КПСС, рашэнняў з'ездаў партыі і Пленумаў ЦК КПСС; прапаганда гераічнага мінулага і сучаснага жыцця савецкага народа, яго слаўных Узброеных Сіл, прапаганда рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцый нашай краіны; узбраенне моладзі асновамі ваенных ведаў, аказанне ёй дапамогі ў авалоданні ваеннай тэхнікай і практычнымі навыкамі ваеннай справы; выхаванне любві да Савецкіх Узброеных Сіл і армій краін Варшаўскага Дагавору, павага да ратнай працы воінаў, вера ў сілу і непераможнасць савецкай зброі.

Каардынуе ўсю работу па ваенна-патрыятычнаму выхаванню студэнтаў сектар ваенна-патрыятычнага выхавання пры парткоме БДУ.

Вялікія магчымасці для ваенна-патрыятычнага выхавання адкрывае перш за ўсё сам навучальны працэс. Гэта звязана з тым, што грамадскія, агульнанавуковыя і спецыяльныя дысцыпліны, якія вывучаюцца ва універсітэце, змяшчаюць вялізны матэрыял, які дазваляе весці ваенна-патрыятычнае выхаванне сістэматычна і на высокім ідэйна-тэарэтычным узроўні.

# НЕПАРЫЎНАЕ АДЗІНСТВА

Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акрузе, аднаму са слаўных баявых атрадаў доблесных Савецкіх Узброеных Сіл — 60 год. Гэта дата выклікае законную радасць і гонар у ветэрана, які прайшоў многія вёрсты па франтавых дарогах, і ў маладога воіна, кожнага савецкага чалавека.

Беларуская ваенная акруга народжана ў полымі і парахавым дыме грамадзянскай вайны для самых гуманных мэт— надзейна ахоўваць і зберагаць народнае шчасце, вялікую краіну сацыялізму на яе заходніх рубяжах.

Сапраўды сімвалічны той факт, што слаўны юбілей акругі адзначаецца напярэдадні знамянальнай падзеі — 60-годдзя Беларускай ССР і Камуністычнай партыі Беларусі. Гэта вялікае і радаснае свята для беларускага народа і воінаў акругі. Гераічная гісторыя нашай акругі непарыўна звязана з дзейнасцю слаўнага атрада КПСС — Камуністычнай партыі Беларусі, якая ўжо на сваім першым з'ездзе 30 снежня 1918 года праявіла вялікі клопат аб узброенай абароне сацыялістычных заваёў і звярнулася са спецыяльным заклікам «Да рабочых, батракоў, сялян і салдат Чырвонай Арміі Беларускай Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі».

Да вас, воіны і барацьбіты за перамогу сацыялізму, гаварылася ў гэтым закліку, — звернуты нашы позіркі... Цяпер, калі нямецкі імперыялізм ляжыць, павергнуты ў прах, і яму на змену спяшаюцца іншыя грабіцелі, мы ўскладаем на вас новую ганаровую задачу — абарону Беларускай рэспублікі ад гатовых кінуцца на яе ворагаў. Мы не сумняваемся, што вы з гонарам справіцеся з гэтай справай, што аб вашы магутныя рады разаб'юцца ўсе сілы контррэвалюцыі...».



**На здымку:** у час канферэнцыі.

Фота **А. Шарава.**

Стварэнне БССР і Кампартыі Беларусі, якое адбывалася пад кіраўніцтвам ЦК РКП(б) і асабіста У. І. Леніна, адыграла вялікую ролю ў справе далейшага будаўніцтва і ўмацавання Чырвонай Арміі ў заходніх раёнах краіны. Пашырыўся і ўзмацніўся партыйны ўплыў у войсках нашай акругі, палепшылася работа ваенных камісарыятаў на месцах, паўней сталі задавальняцца патрэбы і запыты асабовага саставу.

З першых дзён стварэння атрадаў Чырвонай Арміі ў Беларусі байцы і камандзіры адчувалі вялікі клопат аб іх беларускага народа.

Нельга без хвалявання чытаць пісьмы працоўных Беларусі тых далёкіх гадоў. Вось толькі адно з многіх рашэнняў сходу сялян Вітуніцкай воласці Барысаўскага ўезду. «Хаця вёска наша невялікая і бедная, — пісалі яны, — але для падтрымкі нашых таварышаў, якія грудзямі абараняюць наш рабоча-сялянскі ўрад ад ненавіснай буржуазіі, вырашылі сабраць з 48 дамоў апошнія нашы працоўныя крошкі і паслаць таварышам-чырвонаармейцам, просячы іх стойка і цвёрда стаяць за ўладу працоўнага народа».

Вялікі ўклад у справу адукацыі і выхавання воінаў акругі ўнесла і дагэтуль уносіць беларуская інтэлігенцыя. Тут прыемна адзначыць, што сярод тых, хто першым прыняў удзел у ліквідацыі непісьменнасці сярод чырвонаармейцаў акругі, хто выступіў ініцыятарам ваенна-шэфскай работы, быў прафесарска-выкладчыцкі калектыў Беларускага дзяржаўнага універсітэта. І за гэта мы выказваем яму нашу шчырую салдацкую ўдзячнасць.

Шэфства беларускай інтэлігенцыі над воінамі акругі дае добрыя вынікі, якія перш за ўсё якасна ўплываюць на рост палітычнай свядомасці ўзброеных абаронцаў Радзімы, павышэнне іх культуры. А гэта ў канчатковым выніку садзейнічае росту іх баявога майстэрства і павышэнню баявой гатоўнасці часцей і падраздзяленняў.

Клопат аб воінах Савецкіх Узброеных Сіл Камуністычнай партыі Беларусі, урада рэспублікі, усяго беларускага народа, як і яго дасягненні ў выкананні рашэнняў XXV з'езда КПСС, радуе і натхняе салдат, сержантаў, афіцэраў і генералаў акругі на дасягненне высокіх вынікаў у сваёй баявой вывучцы. У адзінстве са сваім народам воіны чэрпаюць сілы і натхненне для ратнай працы.

Пераканаўчым прыкладам адзінства нашага народа і яго Узброеных Сіл з'яўляецца і гэта навуковая канферэнцыя, якая паслужыць справе далейшага ўзмацнення ваенна-патрыятычнага выхавання студэнцкай моладзі і воінаў акругі ў духу бязмежнай адданасці КПСС, савецкаму народу, Радзіме.

**А. В. ДЗЕБАЛЮК,**
**член Ваеннага савета — начальнік Палітычнага ўпраўлення ЧБВА, генерал-палкоўнік.**

**І. Л. Велічанскі,**
**студэнт IV курса гістфака БДУ**

У сценах ВНУ працякаюць два дыялектычна ўзаемазвязаныя працэсы: з аднаго боку — фарміраванне высокакваліфікаванага спецыяліста, з другога — грамадзяніна, чалавека камуністычнай перакананасці і светапогляду.

Дзейнасць БДУ — наглядное пацвярджэнне сказанаму. І мы, студэнты,—актыўныя ўдзельнікі гэтага працэсу, пераемнікі слаўных традыцый старэйшай ВНУ рэспублікі.

Разам з дыпломам выпускнік універсітэта атрымлівае і званне лейтэнанта, прайшоўшы школу жыццёвай загартоўкі на ваеннай кафедры.

У БДУ добра пастаўлена ваенна-патрыятычнае выхаванне студэнтаў. Камітэт ДТСААФ БДУ за вялікую работу ў гэтай галіне ўзнагароджан Ганаровым знакам ДТСААФ СССР і Ганаровай граматай Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР.

Характэрнай асаблівасцю Беларускага дзяржаўнага універсітэта з'яўляецца яго непарыўная сувязь з Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругай. Выпускнікі БДУ служаць салдатамі і афіцэрамі ў воінскіх часцях акругі, а многія ваеннаслужачыя — студэнты універсітэта.

## УВАГА, КОНКУРС!

**Камітэт камсамола універсітэта аб'яўляе конкурс на лепшую эмблему і назву студэнцкага камсамольска - маладзёжнага кафэ.**

**Пераможцы будуць узнагароджаны. Прапановы і эскізы падаваць у п. № 207 галоўнага корпуса.**

**КАМІТЭТ КАМСАМОЛА.**

**Рэдактар А. ДЗЕРАШ.**

**НАШ АДРАС** 220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.